ДУК “НАВАГРУДСКАЯ РАЁННАЯ БІБЛІЯТЭКА”
АДДЗЕЛ БІБЛІЯТЭЧНАГА МАРКЕТЫНГУ

# КРАЯЗНАЎЧЫ КАЛЯНДАР ЗНАМЯНАЛЬНЫХ І ПАМЯТНЫХ ДАТ НАВАГРУДЧЫНЫ

## на 2022 год



2021

**<u>У 2022 годзе спаўняецца:</u>**

**905 гадоў** з часу пахода князя **Глеба Усяславіча** на Навагрудскую (Навагародскую) зямлю
**770 гадоў** з часу каранацыі Ў Навагрудку вялікага **князя Міндоўга** на караля Літвы
**770 гадоў** з часу нападзення на **Навагрудак** крыжакоў
**760 гадоў** з часу падпісання дагавора паміж князем **Міндоўгам** і Ноўгарадскім Аляксандрам Неўскім аб сумеснай барацьбе супраць Лівонскага Ордэна
**705 гадоў** з часу стварэння **Навагрудскай епархіі Беларускай Праваслаўнай царквы (Беларускага Экзархата Маскоўскага Патрыярхата** (1317, адноўлена ў 1992)
**600 гадоў** з часу вянчання ў Навагрудскім Фарным касцёле караля Польшчы **Ягайлы з Соф'яй Гальшанскай**
**660 гадоў** з дня нараджэння **Ягайла,** вялікага князя ВКЛ, караля Польшчы, заснавальніка дынастыі Ягелонаў
**630** гадоў з часу надання **Гродна** статуса другой сталіцы ВКЛ (1392)
**515** гадоў з часу стварэння (1507) **Навагрудскага ваяводства**, адміністрацыйна-тэрытарыяльнай адзінкі ў Вялікім княстве Літоўскім (існавала па 1795 г.)
**510 гадоў** з часу стварэння **"Навагрудскага Пралога" -** бларускага рукапіснага помніка
**505 гадоў** з часу пачатаку беларускага і ўсходнеславянскага **кнігадрукавання** (6 жніўня 1517)
**505 гадоў** з пачатку будаўніцтва ў Навагрудку **Барысаглебскай царквы** на сродкі князя Канстанціна Астрожскага
**425 гадоў** з часу дазволу пабудаваць у Навагрудку цагельню і паліць вапну (грамата Жыгімонта III)
**410 гадоў** з часу заснавання Любчанскай друкарні (1612)
**405 гадоў** з часу з'езду ўніяцкага духавенства ў в. Руце пад Навагрудкам, на якім было аформлена стварэнне Базыліянскага Ордэна.
**370 гадоў** з часу першага ўпамінання ў дакументах **Навагрудскай ратушы**
**320 гадоў** з часу пабудовы на сродкі М. Вішнявецкага **мураванага езуіцкага касцёла.**
**280 гадоў** з дня нараджэння **Рэйтана Тадэвуша** (каля 1742-1780). палітычнага дзеяча Рэчы Паспалітай. Быў абраны паслом ад Навагрудскага павета на сойм 1773-1775гг.
**260 гадоў** з дня нараджэння **Глінскай Тэафілі Багумілы (**сапр. Букатава; 1762 ці 1763, в. Косічы Навагрудскага раёна – 1799), польскай паэткі. Некаторы час жыла ў в.Шчорсы
**225 гадоў** з пачатку дзейнасці **Дамініканскай школы**
**220 гадоў з часу** ўключэння **Навагрудка** ў склад Гродзенскай губерніі
**210 гадў** з часу пабудовы ў цэнтры **Навагрудка** драўляных гандлёвых радоў
**205 гадоў** з дня нараджэння **Глінскага Антона Юзафа** (1817, в.Шчорсы, Навагрудскага раёна – 1866), беларускага фальклярыста, пісьменніка. Працаваў у Шчорсаўскай бібліятэцы Храптовічаў.

**205 гадоў** з часу збудавання **драўлянай царквы** ў в.Загор’е-Сенненскае Навагрудскага раёна.
**170 гадоў** з дня нараджэння **Марозіка Мікалая Фёдаравіча** (каля 1852, в. Лаўрышава Навагрудскага раёна – пасля 1913), беларускага народнага прапаведніка-маралiста, паэта-самавучкі.
**160 гадоў** з часу заснавана фабрыкі кафлі братоў **Лейтнекераў** у Навагрудку.
**160 гадоў** з часу стварэння падпольнай паўстанцкай арганізацыі на чале з **У.Борзабагатым**
**140 гадоў** з дня нараджэння **Скрабца Пятра Ануфрыевіча** (1882, г.п.Любча – 1963, г.Навагрудак),педагога, выкладчыка, завуча Навагрудскай беларускай гімназіі.
**130 гадоў** з дня нараджэння **Брахоцкага Станіслава** (1892 – 1942),апошняга ўладальніка сядзібы Брахоцкіх у Вераскаве Навагрудскага раёна.
**125 гадоў** з дня нараджэння **Кіпрыяна Ятранскага** (Клімуц ці Клімуць; 1897, в. Альхова Ваўкавысскага раёна – 1942), свяшчэннамучаніка, новапакутніка Навагрудскай епархіі Беларускай Праваслаўнай Царквы.
**100 гадоў** з часу заснавання **“Міцкевічаўскага камітэта” –** дабрахвотнага таварыства па ўвекавечанні памяці А. Міцкевіча (1922
**100 гадоў** з дня нараджэння **Дзедулевіч Паліны Паўлаўны (**1922-расстраляна ў 1943г. ў в.Поўбераг), удзельніцы Вялікай Айчыннай вайны, сакратара падпольнай камсамольскай арганізацыі.
**55 гадоў** з часу закладкі **помніка Невядомаму салдату** ў Навагрудку (1967)
**30 гадоў** з часу устаноўкі **помніка Адаму Міцкевічу** ў Навагрудку на Малым Замку (1992)
**15 гадоў** з часу адкрыцця **помніка Прападобнаму Елісею Лаўрышаўскаму** ў Навагрудку (1997)

## ✧ СТУДЗЕНЬ ✧

**2** - 85 гадоў з дня нараджэння **Марцуля Генадзя Сямёнавіча** (1937, в. Лоўчыцы Навагрудскага раёна - 2008), беларускага гісторыка, педагога, прафесара, у 1959-1960гг. працаваў у Навагрудскай СШ №1
**3** – 80 гадоў з дня нараджэння **Рамановіча Георгія Георгіевіча** (1942, в. Ваўковічы Навагрудскага раёна), беларускага псіхолага, педагога, палкоўніка міліцыі ў адстаўцы, дацэнта акадэміі МУС Беларусі.
**12** – 135 гадоў з дня нараджэння **Каханоўскага Антона** (сапр.Каган; 1887, Навагрудак – 1943), польскага дырыжора.
**12** – 75 гадоў з дня нараджэння **Орды Аляксандра Мікалаевіча** (1947, в.Журавельнікі Навагрудскага раёна), беларускага вучонага ў галіне механізацыі сельскай гаспадаркі, доктара тэхнічных навук.
**22** - 460 гадоў з часу пацвярджэння Навагрудку прывілеі на **Магдэбургскае права**

## ✧ ЛЮТЫ ✧

**2** - 120 гадоў з дня нараджэння **Мішука Ігната Цімафеевіча** (1902, в.Казённыя Лычыцы, Навагрудскага раёна – 1961), члена камуністычнай партыі Заходняй Беларусі, першага старшыні калгаса "17 Верасня" Навагрудскага раёна,старшыні Лаўрышаўскага сельскага Савета.
**6** - 135 гадоў з дня нараджэння **Гнілякевіча Міхаіла Паўлавіча** (1887, в.Асташына Навагрудскага раёна - 1945), беларускага дзяржаўнага дзеяча.
**11** - 215 гадоў з дня нараджэння **Напалеона Орды** (1807-1883), беларускага кампазітара, піяніста, педагога, музычнага пісьменніка, мастака. Маляваў краявіды Навагрудка.
**23** – 95 гадоў з дня нараджэння **Кукаловіча Уладзіміра Аксенцьевіча** (1927, в. Асташына Навагрудскага раёна – 2005), механізатара, Героя Сацыялістычнай працы(1966)

## ✧ САКАВІК ✧

**4 –** 65 гадоў з дня нараджэння **Барысевіча Міхаіла Сямёнавіча** (1957г. в.Пуцэвічы Навагрудскага раёна), воіна-інтэрнацыяналіста, старшыні Навагрудскай раённай арганізацыі "Беларускі саюз ветэранаў вайны ў Афганістане".
**8 –** 110 гадоў з дня нараджэння **Светачавай Лізаветы Андрэеўны** (1912, в.Будзёнаўка Чуркуленаўскага раёна Семіпалацінскай вобл. – 1992). З 1946 года жыла ў Навагрудку, удзельніца Вялікай Айчыннай вайны, ваенны хірург Заходняга і 3-га Беларускага франтоў. У пасляваенны перыяд – заг.хірургічнага аддзялення Навагрудскай раённай бальніцы, гал. урач Навагрудскага туберкулёзнага дыспансера. Заслужаны ўрач БССР.
**12** – 300 гадоў з дня нараджэння **Дабшэвіча Бенядзікта** (1722, нар. каля Навагрудка - 1799), філосафа, тэолага, прадстаўніка эклектычнай філасофіі ў Вялікім Княстве Літоўскім, скончыў Навагрудскі езуіцкі калегіум, выкладаў у ім.
**15** – 80 гадоў з дня нараджэння **Багеля Івана Максімавіча** (1942, в.Баярская Навагрудскага раёна - 2008), беларускага вучонага ў галіне радыёбіялогіі, эндакрыналогіі і фармакалогіі, доктара медыцынскіх навук.
**16 –** 90 гадоў з часу **выступлення сялян в.Асташына** Навагрудскага павета супраць польскіх акупантаў(1932)
**17** – 80 гадоў з дня нараджэння **Усенка Лілii Уладзіміраўны** (1942, в.Кунцаўшчына Гродзенскага раёна), беларускага краязнаўца. У 1980-1997 гг. – дырэктар Дома-музея Адама Міцкевіча ў Навагрудку.

## ✧ КРАСАВІК ✧

**95 -** гадоў з дня нараджэння **Табанюхавай Ганны Рыгораўны** (1927, в.Новыя Лычыцы -.), Заслужанай настаўніцы БССР (1979), загадчыцы музея "Партызанскай славы" ў в.Чарэшля (1966-1979)

**14** – 465 гадоў з дня нараджэння **Сапегі Льва** (1557 - 1633) , **канцлера Вялікага Княства Літоўскага,** дзяржаўнага і ваеннага дзеяча, дыпламата і палітычнага мысліцеля.

## ✧ МАЙ ✧

**1 –** 115 гадоў з дня нараджэння **Кmasановіча Рамуальда** (1907, в.Устрынь Навагрудскага раёна – 1957), польскага мастака, мастацкага педагога.
**2** – 110 гадоў з дня нараджэння **Вінара Мікалая Андрэевіча** (1912., г.Роўна, Украïна – 1977., г.п.Любча), педагога, краязнаўца, даследчыка гісторыі Навагрудчыны, заснавальніка музея Любчанскага краю.
**17 –** 60 гадоў з дня нараджэня **Пальчыка Генадзя Уладзіміравіча** ( 1962., Навагрудак), кандыдата фізіка-матэматычных навук, доктара педагагічных навук, прафесара, старшыні Вышэйшай атэстацыйнай камісіі Рэспублікі Беларусь.
**30** – 160 гадоў з дня нараджэння **Лявонцьева Мікалая Сцяпанавіча** ( 1862, Навагрудак -1910), вайскоўца, дыпламата, падарожніка. Служыў ў Гродзенскім гусарскім палку.

## ✧ ЧЭРВЕНЬ ✧

**24** – 255 гадоў з дня нараджэння **Грабоўскага Стэфана** (Стэфан; 1767, в. Асташына Навагрудскага раёна – 1847), ваеначальніка, генерала дывізіі,аднаго з кіраўнікоў паўстання 1794 г., удзельніка вайны Расіі з Рэччу Паспалітай 1792г., Айчыннай вайны 1812г., Русска-турэцкай вайны 1828-1829 гг., дзяржаўнага дзеяча.

## ✧ ЛІПЕНЬ ✧

**8** - 75 гадоў з часу заснавання **УА “Навагрудскі дзяржаўны гандлёва-эканамічны каледж”** (1947)
**11** – 70 гадоў з дня нараджэння **Войны Уладзіміра Васільевіча (**1952, в. Нягневічы Навагрудскага раёна). беларускага фізіка, дацэнта ГрДУ імя Я.Купалы.
**12** – 65 гадоў з дня нараджэння **Анiські Пятра Яўгенавіча** (1957, в. Нягневічы Навагрудскага раёна), беларускага біёлага, дацэнта кафедры біяхіміі ГрДУ імя Я. Купалы.
**19 –** 110 гадоў з дня нараджэння **Анішчыка Аляксея Сцяпанавіча (псеўданімы: Андрэй Чэмер, А.Шпак**),( в. Мондзіна Навагрудскага раёна 1912 - 2007)**,** беларускага краязнаўца, педагога, пісьменніка (паэт, празаік, перакладчык, мемуарыст), журналіста, грамадскага дзеяча.
**24 –** 15 гадоў з часу адкрыцця **мемарыяльнай экспазіцыі** . прысвечанай супраціўленню яўрэяў Навагрудчыны ў гады Халакоста(2007)

**31** – 220 гадоў з дня нараджэння **Дамейка Ігната Іпалітавіча** (маёнтак В.Мядзведка Навагрудскага павета ў 1802 г. – 23.01.1889, Чылі), вучонага-даследчыка, геолага, удзельніка тайнага таварыства філаматаў.

## ✧ ЖНІВЕНЬ ✧

**30** – 80 гадоў з дня нараджэння архіепіскапа **Яўгена** (свец. Ждан Яўген Барысавіч; 1942, Навагрудак – 2002), рэлігійнага дзеяча, епіскапа Рускай Праваслаўнай Царквы, архіепіскапа Ніжагародскага і Арзамаскага.

## ✧ ВЕРАСЕНЬ ✧

**1** – 80 гадоў з дня нараджэння **Басюка Івана Аляксандравіча** (1942, в. Амневічы Навагрудскага раёна) беларускага гісторыка, правазнаўца, педагога, выдатніка адукацыі Беларусі. З 1987 г. выкладаў у ГрДУ імя Я.Купалы.
**5** - 135 гадоў з дня нараджэння **Каўцэвіча Мікалая Мікалаевіча** (1887, г.п. Любча Навагрудскага раёна – 1949), беларускага фізіка, прафесара, заслужанага дзеяча навукі Беларусі, кавалера ордэна “Знак Пашаны”.
**10** – 90 гадоў з дня нараджэння **Шурак Ніны Пятроўны** (1932, в.Мілушава Навагрудскага раёна – 2009,.в.Мілушава), стваральніцы і захавальніцы Навагрудскага гісторыка –краязнаўчга музея.
**11** - 30 гадоў з часу адкрыцця ўстановы культуры “**Навагрудскі гісторыка-краязнаўчы музей**” (1992; заснаваны 25.08.1987г.)
**12 -** 310 гадоў з дня нараджэння **Аскерка Сцяпана Міхаіла** (1712, Навагрудчына -1780…), беларускага вучонага. эканаміста-утапіста, юрыста, асветніка.
**13** – 80 гадоў з дня нараджэння **Кулакоўскай Любові Міхайлаўны** (1942 ці ў 1943г. в. Дзяляцічы Навагрудскага раёна), беларускага дзеяча самадзейнага мастацтва, педагога, заслужанага работніка культуры Беларуі. З 1965 г. – выкладчык Ваўкавысскай ДМШ, а з 1978 – дырэктар Краснасельскай ДМШ, адначасова кіраўнік Ваўкавысскага народнага хору.
**17** – 100 гадоў з дня нараджэння **Шышэя Кастуся** (1922, в.Краскоўскія Горы Навагрудскага раёна – 2004), дзеяча беларускага нацыянальнага руху.

## ✧ КАСТРЫЧНІК ✧

**3** – 100 гадоў з дня нараджэння **Наўмовіча Міхася Іванавіча** (1922, в.Кашалева Навагрудскага раёна – 4.03.2004 Вальпэн,Францыя), беларускі мастак і скульптар, выкладчык, удзельнік французскага Супраціўлення ў гады Другой сусветнай вайны, грамадскага дзеяча беларускай эміграцыі.
**5 –** 100 гадоў з дня нараджэння **Каралько Ніны Міхайлаўны** (1922, в.Кашалева Навагрудскага раёна – 2016), майстра народнага мастацкага ткацтва, народнага майстра Беларусі.

## ✧ ЛІСТАПАД ✧

**10** гадоў з часу ўстаноўкі **помніка Уладзіміру Высоцкаму** ў Навагрудку**.**
**2** – 245 гадоў з дня нараджэння **Жулкоўскага Фартуната Алойзы** (1777, Навагрудчына – 11.09.1822), польскага акцёра, драматурга, перакладчыка, выдаўца, удзельніка паўстання1794г.
**9** – 100 гадоў з дня нараджэння **Мельнікава Аляксандра Лявонцьевіча** (1922) – Ганаровага грамадзяніна г.Навагрудка, генерал-маёра, быўшага начальніка артылерыі 856 стралковага палку 283 стралковай дывізіі, якая ў ліпені 1944 года вызваляла Навагрудак ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў.
**13** – 125 гадоў з дня нараджэння **Аркадзьева (сапр.Цівунчык) Аркадзя Станіслававіча** (1897г., в. Журбілавічы Навагрудскага павета – 1969), беларускага акцёра, рэжысёра, заслужанага артыста Беларусі.
**15 –** 100 гадоў з дня нараджэння **Валчэцкага Віктара Дзмітрыевіча** (1922, в.Навіны Навагрудскага раёна – загінуў 5 чэрвеня 1944), удзельніка Вялікай Айчыннай вайны, партызана атрада "Кастрычнік"

## ✧ СНЕЖАНЬ ✧

**16 – 60** гадоў з дня нараджэння **Янушкевіча Валяр'яна Язэпавіча** (1962г.),беларускага скульптара. Аўтар помніка Адаму Міцкевічу (1992)
**31** - 115 гадоў з дня нараджэння **Мальца Івана Васільевіча** (1907,в.Мольнічы, Навагрудскі раён - 2000), першага сакратара ЦК КСМЗБ, удзельніка Вялікай Айчыннай вайны, педагога, Заслужаны настаўнік БССР (1966)

Складальнік: Н.В.Міселя
Набор і камп’ютарная вёрстка: Н.В.Міселя
Рэдактар: С.І.Івашкевіч
Надрукавана на абсталяванні Навагрудскай раённай бібліятэкі.
Наклад 15 асобнікаў. Ад 18.11.21